# Паўтарэнне вывучанага ў V класе

## § 4. Словазлучэнне і сказ. Знакі прыпынку ў простых і складаных сказах

**20.** Прачытайце табліцу. Раскажыце на яе аснове пра розныя віды сказаў.

**СКАЗ**

- **па мэце выказвання**
  - апавядальны
  - пытальны
  - пабуджальны
- **па інтанацыі**
  - клічны
  - няклічны
- **па наяўнасці ці адсутнасці даданых членаў сказа**
  - развіты
  - неразвіты
- **па колькасці граматычных асноў**
  - просты
  - складаны

**21.** Прачытайце тэкст. Сфармулюйце яго тэму і асноўную думку. Прывядзіце з тэксту прыклады сказаў, якія ілюстравалі б схему (практ. 20).

### Чароўны кошык

Бабуля з Марынкай ужо з самага ранку былі ў лесе.

— Ну, унучка, хваліся! Ці шмат сабрала?

Марынка зазірнула ў бабулін кош. Колькі грыбоў! А ў яе — адзін[ф] баравік!

— Пачакай, я ж не навучыла цябе чароўным словам. Нахіліся да кошыка і прашапчы: «Пад ялінкі і галінкі, пад лісточкі паглядай, усе грыбочкі пазбірай!»

Марынка зашаптала. І раптам угледзела лісічку, а потым і цэлую сямейку. Дзяўчынка перабягала з месца на месца...

— Навучыў цябе кошык грыбы збіраць! Цуд! — пахваліла бабуля.

— Гэта ж не ён, а я пад кожную травінку, пад кожны лісток заглядвала. Цуды толькі ў казках бываюць, — засмяялася Марынка.

Дома Марынка і бабуля прыгатавалі смажаныя лісічкі са смятанай *(Паводле Т. Бунта)*.

Выпішыце з тэксту сказ, які адпавядае наступнай схеме:

_._._._._._ ________ і ________ ======== ~~~~~~ – – – – – – – – – – .

Назавіце ў ім галоўныя і даданыя члены сказа. Запішыце ўсе магчымыя словазлучэнні. Абазначце галоўнае слова ў словазлучэннях.

**22.** Прачытайце сказы. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

1. Памый грыбы. Парэж іх, але не вел**ь**мі дробна.
2. Дачакайся, калі вадкасць ад грыбоў выпарыцца, і падсмажвай лісічкі 10—15 хвілін. Крыху пасалі́.
3. Дробна парэ**ж** цыбулю і абсма**ж** яе ў алеі*. Калі цыбулька стане зала**ц**істай, дадай лісічкі.
4. Выкладзі смажаныя лісічкі на талерку з варанай бульбай. Дадай пятрушку, кроп. Можаш частаваць сям'ю.
5. Пакладзі ў патэльню з грыбамі см**я**тану і гатуй 10 хвілін *(Паводле Т. Бунта)*.



Размясціце сказы ў такой паслядоўнасці, каб атрымаліся рэкамендацыі па гатаванні смажаных лісічак са смятанай. Прачытайце тэкст.

Выпішыце з тэксту прыклады сказаў: 1) просты сказ; 2) просты сказ з аднароднымі членамі; 3) складаны сказ са злучнікам ***калі***.

Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

Рэцэпт гатавання якой стравы вы ведаеце? Раскажыце пра гэта сваім аднакласнікам.

**23.** Прачытайце тэкст.

У Беларусі шмат розных рэк. Галоўныя рэкі Беларусі: Дняпро, Прыпяць, Бярэзіна, Сож, Нёман, Заходняя Дзвіна.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Большасць гарадоў пабудаваны на іх берагах, бо нашы продкі сяліліся звычайна каля рэк і азёр.

Ёсць[ф] сярод нашых рэк адна незвычайная. Гэта рака Няміга. У старажытным Мінску яна з'яўлялася ракой-вуліцай. Па ёй плавалі на чаўнах тагачасныя гарадскія жыхары. Раней Няміга была прыгожая, а потым звузілася і змялела. Сёння яна цячэ ў падземнай[с] трубе пад вуліцай Нямігай у Мінску.

**Рэкі — гэта блакітныя шляхі Беларусі, а азёры людзі ласкава называюць яе «блакітнымі вачыма».** Самыя вялікія азёры — гэта Нарач, Чорнае, Асвейскае, Браслаўскія, Свіцязь. Амаль кожнае возера хавае мноства таямніц і загадак... *(Паводле кнігі «Мая Радзіма — Беларусь»).*

Што з'яўляецца блакітнымі шляхамі Беларусі, а што — яе блакітнымі вачыма? Як вы думаеце, чаму аўтар робіць такія параўнанні?

Назавіце галоўныя рэкі Беларусі, яе самыя вялікія азёры.

На колькі сэнсавых частак можна падзяліць тэкст? Пра што гаворыцца ў кожнай з іх?

Спішыце частку, у якой расказваецца пра незвычайную раку ў Беларусі. У чым яе незвычайнасць? Вызначце, якім спосабам звязваюцца сказы ў гэтай частцы. Падкрэсліце словы, пры дапамозе якіх сказы звязаны паміж сабой.

Складзіце схему выдзеленага сказа. Вызначце яго будову. Назавіце галоўныя і даданыя члены сказа. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку.

**24.** Спішыце тэкст. Раскрыйце дужкі, дапасуйце прыметнікі да назоўнікаў. Пастаўце неабходныя знакі прыпынку. Абазначце галоўныя словы ў словазлучэннях з прыметнікамі.

### Беларускае мора

Так нярэдка называюць Нарач. Нарач адносіцца да азёр якія не зарастаюць раслінамі. У іх *(чысты)* і *(празрысты)* вада. Такія *(вялікі)* і *(глыбокі)* азёры называюць аліготрофнымі. У іх адбываецца *(безупынны)* рух вады ад ветру і ад *(глыбінны)* плыней. Дзякуючы гэтаму *(прыбярэжны)* паласа не ператвараецца ў балота а возера заўсёды чыстае і адкрытае *(Паводле В. Вольскага).*